Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. СЕРАДА № 198 (28056) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

САМАЯ ВЫСОКАЯ МІСІЯ НА ЗЯМЛІ

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Днём маці!

У гэтае светлае свята ніхто не можа застацца раўнадушным.

Колькі б гадоў нам ні споўнілася, менавіта да маці мы звяртаемся перш за ўсё, менавіта яна больш, чым хто-небудзь іншы, радуецца нашым поспехам, падтрымлівае пры няўдачах, перажывае за кожны наш крок па жыццёвым шляху. Над яе нястомным бацькоўскім клопатам не ўладныя ні час, ні адлегласці.

Па значнасці і адказнасці мацярынская місія не ведае сабе роўных. Даць жыццё малому, выхаваць яго сапраўдным чалавекам — вялікае прызначэнне. Перш за ўсё ад маці дзіця атрымлівае ўрокі маральнасці, справядлівасці, любові да сваёй Айчыны.

Шчаслівы той чалавек, якога ахоўваюць мацярынская любоў і малітва. Таму сёння кожны з нас павінен сказаць самаму дарагому чалавеку цёплыя словы ўдзячнасці.

Мілыя маці і бабулі, нізкі паклон вам!

Дзякуй за падоранае жыццё, за бязмежнае цярпенне, за ўкладзеныя ў нас сілы, за цяпло дамашняга ачага.

Няхай справы, учынкі і лёсы вашых дзяцей і ўнукаў прыносяць вам толькі радасць і гонар.

Будзьце здаровыя і шчаслівыя доўгія-доўгія гады!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

КРОКІ НАПЕРАД І НАСУСТРАЧ

Прэзідэнт Беларусі прапануе Аўстрыі адкрыць новую старонку ў адносінах

Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прэзідэнтам Палаты эканомікі Аўстрыі Крыстафам Ляйтлам і першым намеснікам старшыні Нацыянальнага савета Аўстрыі Карлхайнцам Копфам.

«Нам трэба на аснове таго вопыту супрацоўніцтва, які ў нас ёсць, адкрываць новую старонку і рухацца наперад», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў аўстрыйскаму боку за інвестыцыі і крэдытную дапамогу, аказаную пры мадэрнізацыі беларускіх прадпрыемстваў. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі будуць з вялікім задавальненнем вітаць аўстрыйскі бізнес.

«Умова толькі адна — каб тыя, хто прыходзіць сюды, ставіліся да нашага народа так, як да працоўных у Аўстрыі, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мы вас будзем абараняць так, як і свае беларускія кампаніі. Вы нам чужымі не будзеце, мы будзем рабіць усё, каб вам тут было камфортна. І з боку аўстрыйскага бізнесу такія ж павінны быць прыстойныя адносіны да нашай дзяржавы, да нашага народа».

Аляксандр Лукашэнка лічыць невыпадковай сустрэчу менавіта з прадстаўнікамі аўстрыйскай дзяржавы пасля праведзеных у Беларусі прэзідэнцкіх выбараў. Ён звярнуў увагу, што ў пачатку яго першага прэзідэнцкага тэрміну ў яго памяці засталіся сустрэчы і тэмы, звязаныя з узаемаадносінамі з Аўстрыяй. «І мне тады падалося, што Захад неяк размеркаваў свае ролі на постсавецкай прасторы, і нам дасталася такая высокатэхналагічная і ў чымсьці падобная да нас Аўстрыя», — сказаў беларускі лідар.

«На гэтым этапе, калі быццам бы ў нас пацяпленне адбываецца з Еўрасаюзам і з асобнымі краінамі Еўрасаюза, напэўна, невыпадкова і заканамерна тое, што мы сёння сустракаемся з вамі і ў Мінску праходзяць мерапрыемствы, звязаныя з эканамічным супрацоўніцтвам: з аднаго боку прадстаўнікі Еўразійскага эканамічнага саюза, з другога — Еўрапейскага саюза ў асобе не чужой ужо нам Аўстрыі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

«Новы этап пачынаецца ў жыцці маім і, напэўна, нашага грамадства ў цэлым. Гэта яшчэ трэба асэнсаваць», — дадаў ён.

У сваю чаргу першы намеснік старшыні Нацыянальнага савета Аўстрыі Карлхайнц Копф лічыць, што ўслед за прыпыненнем ЕС санкцый у дачыненні да Беларусі будуць зроблены і іншыя крокі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

«Не бывае выпадковых супадзенняў. Думаю, што наша сустрэча таксама невыпадковае супадзенне, а ўдалы збег абставінаў», — сказаў ён.

«У мінулую нядзелю вы атрымалі пераканаўчую перамогу на прэзідэнцкіх выбарах. Учора Еўрасаюз зрабіў першы крок да адмены санкцый. Упэўнены, што за гэтым будуць і іншыя крокі і ў нашых адносінах сапраўды будзе адкрыта новая старонка, мы ўступім у новую эру», — адзначыў Карлхайнц Копф.

Ён выказаў задавальненне тым, што Аўстрыя традыцыйна адыгрывала важную ролю ў наладжванні кантактаў паміж Беларуссю і ЕС у зняцці напружанасці. «У гэтым сэнсе мы ўнеслі пэўны ўклад і рады гэтаму», — сказаў першы намеснік старшыні Нацыянальнага савета Аўстрыі.

ВІНШАВАННІ З ПЕРАМОГАЙ

У адрас Аляксандра Лукашэнкі працягваюць паступаць віншаванні ў сувязі з яго перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Таджыкістана. Кіраўнікі дзяржаў абмяняліся думкамі па некаторых актуальных пытаннях двухбаковага беларуска-таджыкскага парадку дня. Эмамалі Рахмон павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У тэлефоннай размове Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Рэспублікі Малдова Мікалаем Цімофці кіраўнікі дзяржаў коратка закранулі некаторыя пытанні беларуска-малдаўскіх адносін. Мікалай Цімофці павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перавыбраннем на пасаду Прэзідэнта Беларусі.

Беларускага лідара павіншавалі з перамогай на выбарах Прэзідэнт Азербайджанскай Рэспублікі Ільхам Аліеў, Прэзідэнт Рэспублікі Арменія Серж Саргсян, Прэзідэнт Рэспублікі Нікарагуа Даніэль Артэга, Прэзідэнт Рэспублікі Сербія Тамислаў Нікаліч, Прэзідэнт Рэспублікі Узбекістан Іслам Карымаў.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

15 кастрычніка 2015 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне дзясятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Святочнае

СПАЧАТКУ БЫЛА... МАМА

Напэўна, не цяжка падабраць трапяткія і шчырыя словы, каб выказаць сваё прызнанне самай любімай і самай блізкай жанчыне на свеце. Але колькі б мы ні казалі, колькі б ні складалі вершаў у гонар маці, гэтых слоў ніколі не будзе зашмат...

СТАР.2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«На наступны год прадугледжана прафінансаваць на Br7,3 трлн будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай. Гэта і дзяржзаказ, і кватэры для шматдзетных сем'яў. Ёсць і некалькі ЖБВК, якія неабходна скончыць у 2016 годзе. Цяпер у нас налічваецца 14 дамоў з перавышэннем нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва. Да канца года плануем, што застанецца адзін. Адзначу, што будаўнічыя работы апярэджваюць графік выдзялення сродкаў. Калі нейкія аб'екты не паспеем прафінансаваць сёлета, па выніках студзеня наступнага года разлічымся. Новыя праблемныя дамы з'явіцца не павінны».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.10.2015 г.

Долар ЗША	17243,00	▲
Еўра	19646,00	▲
Рас. руб.	277,14	▼
Укр. грыўня	784,66	▲

■ Падзея

СТАНДАРТЫ МІЖНАРОДНАГА ЎЗРОЎНЮ

Генасамблея МЭК, якая праходзіць у Мінску, адкрывае новыя магчымасці для айчынных вытворцаў

У Мінску адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця 79-й Генеральнай асамблеі Міжнароднай электратэхнічнай камісіі. Як адзначыў прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў, гэта падзея з'яўляецца знакавай для Беларусі і будзе садзейнічаць фарміраванню яе іміджу як дзяржавы з прывабнымі ўмовамі для вядзення бізнесу, сучасным узроўнем прамысловасці і навукі.

Падчас цырымоніі адкрыцця 79-й Генеральнай асамблеі МЭК.

Фота БЕЛТА.

ВЫСОКАЯ ЯКАСЦЬ У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

Падчас урачыстага адкрыцця **прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ** у сваім выступленні падзякаваў прэзідэнту МЭК Дзюндзі Намура і генеральнаму сакратару, выканаўчаму дырэктару МЭК Францу Врэсвіку за падтрымку рашэння аб правядзенні Генасамблеі ў Беларусі. Паводле яго слоў, прамысловасць нашай краіны арыентуецца на выпуск якаснай прадукцыі, укараненне інавацый, мадэрнізацыю тэхналагічных і кіраўнічых працэсаў, а таксама эканомнае выкарыстанне рэсурсаў. Прычым найбольш актуальныя гэтыя пытанні менавіта зараз якраз таму, што на глабальным рынку як ніколі раней узмацняецца канкурэнцыя, а таксама развіваюцца інтэграцыйныя працэсы ў многіх рэгіёнах. Сёння развіццё любой эканомікі непарыўна звязана з рацыянальным выкарыстаннем усіх відаў рэсурсаў і энергазбераржэннем, таму павышэнне эфектыўнасці выкарыстання энергіі з'яўляецца адной з базавых умоў устойлівага развіцця эканомікі. Андрэй Кабякоў адзначыў, што ўдзел Беларусі ў міжнародных арганізацыях па стандартызацыі дапамагае фарміраваць прадуманую тэхнічную палітыку краіны, што дазваляе скараціць выдаткі і спрыяе спрашчэнню для міжнароднага гандлю.

ВЫЗНАЧАЦЬ ТЭХНАЛОГІІ БУДУЧЫНІ

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА ў сваю чаргу адзначыў, што карысць для прамысловасці і бізнесу Беларусі ад правядзення мерапрыемства відавочная. Ён мяркуе, што падзея паспрыяе актывізацыі ўдзелу беларускіх экспертаў у міжнароднай стандартызацыі.

«Сфера дзейнасці Генеральнай асамблеі МЭК мае на ўвазе распрацоўку міжнародных стандартаў у галіне энергетыкі, электратэхнікі, электронікі, інфармацыйна-камунікацыйных прыбораў — усяго таго, што з'яўляецца асновай для развіцця тэхналогій будучыні. Можна сказаць, што тыя пасяджэнні, якія праходзілі ўвесь мінулы тыдзень да цырымоніі адкрыцця, вызначалі, якой заўтра будзе тэхніка і энергетыка», — растлумачыў Віктар Назаранка.

Ён таксама расказаў, што для экспертаў усяго свету асабліва важным з'яўляецца абмеркаванне таго, што зменіцца ў будучыні для спажыўцоў электрычнасці.

«Для нашай краіны асабліва важна развівацца разам з сусветнымі стандартамі. Каб быць канкурэнтаздольнымі, неабходна ствараць свае стандарты, на якія будуць арыентавацца іншыя краіны. Мы экспартаарыентаваная дзяржава, нам важна ведаць, што трэба ў іншых рэгіёнах, і таму мы павінны актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх працэсах, якія адбываюцца ў сферы стандартызацыі», — падкрэсліў Віктар Назаранка.

Прэзідэнт МЭК Дзюндзі Намура і генеральны сакратар МЭК Франц Врэсвік адзначылі высокі ўзровень падрыхтоўкі Генасамблеі.

«Мы лічым, што гэтая сустрэча мае важнае значэнне для прамысловасці Беларусі. Гэта магчымасць для вашых экспертаў сустрэцца з калегамі з усяго свету. Больш за тое, у рамках сустрэч тэхнічных камітэтаў плануецца распрацоўка новых стандартаў, дзе беларускі бок можа ўзяць удзел», — адзначыў сакратар МЭК Франц Врэсвік.

Падчас 79-й Генеральнай асамблеі МЭК эксперты будуць абмяркоўваць пытанні ўкаранення аднаўляльных крыніц энергіі, рацыянальнага выкарыстання электрычнасці, сучасных прыбораў і абсталявання — усё тое, чым сёння могуць карыстацца і ўжываць у свеце найбольш развітыя краіны.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Ізраіль: тры чалавекі загінулі, дзясяткі паранены

У Ізраілі тэрарысты працягваюць адзінкавыя напады на мясцовых жыхароў. Тры чалавекі загінулі, дзясяткі пацярпелі падчас пяці нападаў зламыснікаў у Іерусаліме і Раанане, як паведамляе інфармацыйны партал Ynet. Па звестках газеты Haaretz, у серыі нападаў загінулі тры чалавекі, раненні ў ходзе чатырох нападаў атрымалі больш за 30 чалавек.

Антыісламскія актывісты правялі мітынг у Дрэздане

У акцыі пратэсту, арганізаванай антыісламскай групай PEGIDA ў нямецкім Дрэздане, прыняло ўдзел каля 8000 чалавек, як перадаюць інфармагенцтвы. Выступоўцы, у тым ліку сузаснавальнік групы Лютц Бахман, асудзілі рашэнне канцлера Германіі Ангелы Меркель і яе ўрада прыняць сотні тысяч бежанцаў, многія з якіх прыбылі з Сірыі, Афганістана і Ірака. «Яны вядуць нас да еўрапейскай грамадзянскай вайны», — заявіў Бахман. Пратэстоўцы адказалі скандіраваннем «Меркель павінна сысці» і заклікамі дэпартаваць бежанцаў.

Еўропу накрылі моцныя снегапады

Небывалыя для восені снегапады накрываюць еўрапейскія краіны. Як паведамляюць інфармагенцтвы, заўчасная зіма заблакіравала аўтамагістралі і забрала жыцці некалькіх чалавек. Так, у выніку моцных снегападаў у некаторых ваяводствах на поўдні Польшчы загінулі два чалавекі. З прычыны слізкіх дарог у аварыі загінула сямігадовая дзяўчынка. Яшчэ адзін чалавек замерз, заснуўшы на лаўцы. Вышыня снежнага покрыва месцамі дасягае 20 см. Напярэдадні ў паўночных раёнах Славакіі выпала каля 25 см снегу, які стаў прычынай дзясяткаў буйных аўтааварый. Метэаролагі прагназуюць верагоднасць узмацнення снегападаў. У Румыніі ад снегападаў і шквальных парываў ветру дзясяткі населеных пунктаў засталіся без святла, частка аўтадарог заблакіравана.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Сыр з цвіллю і гарох абароняць ад раку і хваробы Альцгеймера

Паводле слоў спецыялістаў з Інстытута Вейцмана, прадукты, багатыя на спермідын, такія як зялёны гарох, кукуруза, соевыя бабы і блакітныя сыры, дапамагаюць пражыць даўжэй. Ад зніжэння ўзроўню поліамінаў у арганізме цыркадныя рытмы запавольваюцца. Аднак дабаўкі са спермідынам здольныя гэта змяніць. Яны амалоджваюць арганізм і зніжаюць рызыку ўзроставых захворванняў, піша The Daily Mail. Поліаміны — малекулы, якія арганізм атрымлівае з ежай. Акрамя таго, яны выпрацоўваюцца ў клетках. Гэтыя малекулы рэгулююць шэраг важных працэсаў, напрыклад рост і размнажэнне клетак.

КОРАТКА

У Мінску ў сакавіку—верасні гэтага года прынята 1 тыс. 475 рашэнняў аб прызначэнні сямейнага капіталу, у Брэсцкай вобласці — 1 тыс. 757, Віцебскай — 738, Гомельскай — 1 тыс. 309, Гродзенскай — 1 тыс. 134, Мінскай — 1 тыс. 512, Магілёўскай вобласці — 824.

Савет ЕС прыняў рашэнне прыпыніць на 4 месяцы дзеянне санкцый у дачыненні да Беларусі.

Электрацягнікі гарадскіх ліній злучаць Мінск з гарадам-спадарожнікам Смалявічы ўжо ў лістападзе.

Міністэрства па падатках і зборах Беларусі зацвердзіла Інструкцыю аб парадку ажыццяўлення кантролю за адпаведнасцю расходаў грамадзян іх даходам. Разлік будзе складацца за кожны каляндарны год на падставе існуючых у распараджэнні падатковых органаў звестак без запатрабавання дэкларацыі. Калі расходы грамадзяніна перавышаюць яго даходы, то яму накіроўваецца пісьмовае патрабаванне аб дачы тлумачэнняў аб крыніцах даходаў.

Бліскучая атрута з табліцы Мендзялеева

Ртуць па-ранейшаму застаецца крыніцай высокай небяспекі

У даўнія часы людзей ад кішэчнай непраходнасці лячылі вельмі проста: давалі выпіць... шклянку ртуці. Старажытныя эскулапы думалі, што яна лёгка пройдзе па кішэчніку і «праб'е» яго з-за сваёй цяжкасці і цякучасці. Але небаракі пасля такога лячэння рэдка выжывалі.

— Цяпер жа такое варварства беспаваротна сышло ў гісторыю, — расказвае **начальнік цэнтра хімічнай і радыяцыйнай абароны Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС Васіль ШАЛЕПІН.** — Праўда, аб'ёмы ртуці, якія могуць нашкодзіць чалавеку, не зменшыліся. Некалькі гадоў таму нас выклікалі на домабудаўнічы камбінат. Хтосьці з супрацоўнікаў разліў каля паўкілаграма ртуці ў раздзявальні. Змены мяняліся, людзі хадзілі туды-сюды... А калі нас выклікалі ў гэтую раздзявальню, мы зніякавелі: усё было заліта рознакаліберными шарыкамі ртуці. Нам паставілі задачу: завод праз суткі мусіў зноў працаваць, бо прастой прыносіў вялікі ўрон. Яе мы выканалі. Але калі б ртуць пастаяла хоць некалькі дзён, такога эфекту не дабіліся б...

СТАР. 6